**ВОДЗЫЎ**

на дысертацыю Талмачовай Святланы Аляксандраўны

**“Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)”**,

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені

доктара гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання Талмачовай С. А. “Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)” адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, а таксама сферы даследавання – сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства на тэрыторыі Беларусі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджанага ВАК Рэспублікі Беларусь (загад № 180 ад 01.06.2022).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Вывучэнне ўзаемадзеяння ўлады і грамадства, цэнтра і перыферыі, цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання прыцягвае ўвагу сучасных даследчыкаў. Вялікую цікавасць і значнасць для разумення развіцця беларускага грамадства, фарміравання перадумоў станаўлення сучаснай беларускай дзяржаўнасці працягвае выклікаць вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі, аграрных праблем, трансфармацый на аснове новых метадалагічных падыходаў. Пры гэтым пераасэнсоўваюцца традыцыйныя погляды, у тым ліку на сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываліся ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі. Спалучэнне гэтых актуальных у айчыннай гістарыяграфіі кірункаў знайшло сваё непасрэднае прымяненне ў дысертацыйным даследаванні С.А.Талмачовай.

Сістэмнае вывучэнне пытанняў, звязаных з арганізацыяй і дзейнасцю спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. упершыню стала прадметам доктарскага дысертацыйнага даследавання. І гэта дазваляе гаварыць аб новым напрамку ў айчыннай гістарыяграфіі.

Неабходнасць мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных адносін, у тым ліку і ў аграрным сектары эканомікі, паўстала востра ў Расійскай імперыі пасля паражэння ў Крымскай вайне. Скасаванне прыгоннага права было немагчымым без стварэння спецыяльнага дзяржаўнага механізму кіравання на месцах, на які ўскладваліся задачы ажыццяўлення аграрнай палітыкі ўрада на

практыцы. Вывучэнне прычын арганізацыі гэтых устаноў, іх структуры, функцый, фарміравання штатнага складу і вынікаў дзейнасці на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца актуальным і новым у айчыннай гістарыяграфіі, як і ў цэлым вывучэнне адмены прыгоннага права, рэфармавання аграрных адносін у Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст.

У гістарычнай навуцы назапашана значная колькасць даследаванняў па аграрнай гісторыі Беларусі парэформеннага перыяду, але на парадак дня паўстае патрабаванне іх крытычнага пераасэнсавання з улікам сучасных метадалагічных падыходаў.

Аграрныя пераўтварэнні, якія праводзіліся расійскім урадам на працягу 1861–1914 гг., былі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Пры гэтым новыя рэаліі часу патрабавалі змен у структуры і функцыях органаў дзяржаўнага кіравання па ажыццяўленні ўрадавай аграрнай палітыкі. Вывучэнне не толькі самой сістэмы органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання, але і практычнай дзейнасці кожнага яе структурнага элементу ў гэтым кірунку надае дысертацыйнаму даследаванню С.А.Талмачовай навуковую актуальнасць.

У Рэспубліцы Беларусь аграрная вытворчасць з’яўляецца стратэгічна важнай часткай эканомікі краіны. Таму вывучэнне традыцый, назапашаных у перыяд маштабных аграрных пераўтварэнняў, з’яўляецца актуальнай праблемай для беларускай гістарычнай навукі.

Аналіз гістарыяграфіі дае падставу сцвярджаць, што сістэмнага даследавання спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг. да гэтага часу не было створана, што актуалізуе вылучаны Талмачовай Святланай Аляксандраўнай прадмет даследавання.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Доктарская дысертацыя С.А.Талмачовай “Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)” канцэптуальна развівае актуальны навуковы напрамак даследаванняў, звязаных са зместам і спецыфікай фарміравання і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і кіравання на тэрыторыі Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Прадстаўленае дысертацыйнае даследаванне ўтрымлівае прынцыпова новыя навуковыя вынікі, сукупнасць якіх з’яўляецца значным дасягненнем у гістарычнай навуцы. Гэта знайшло сваё ўвасабленне ў раскрыцці дзейнасці спецыяльна створаных мясцовых па сялянскіх справах устаноў, што дазволіла вылучыць і абгрунтаваць перыяды дзяржаўнай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі і перыядызацыю фарміравання органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі.

У дысертацыйным даследаванні раскрыты перадумовы стварэння і практычная дзейнасць спецыяльна створаных органаў мясцовага кіравання па рэалізацыі рэформы 1861 г.: міравых пасрэднікаў, іх павятовых з’ездаў, губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, павятовых паверачных камісій. Даказана, што гэтыя органы адыгралі вызначальную ролю ў працэсе прававога суправаджэння і ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін у паслярэформенный вёсцы.

Новым у айчыннай гістарыяграфіі з’яўляецца вызначэнне перадумоў рэфармавання структуры мясцовых па сялянскіх справах устаноў паводле закону ад 27 чэрвеня 1874 г. Адзначаны прычыны адтэрміноўкі яго рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі, раскрыты функцыянальныя абавязкі і дзейнасць губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у 70–90-я гг. XIX ст.

На тэрыторыі Беларусі пражывалі ўласцівыя толькі для заходніх губерняў пэўныя катэгорыі сельскага насельніцтва, у тым ліку сельскія вечныя чыншавікі. У дысертацыі С.А.Талмачовай раскрыты стварэнне і дзейнасць павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, прычыны замаруджвання правядзення чыншавай рэформы, адной з якіх было нежаданне ўрада фінансава падтрымліваць чыншавікоў у працэсе выкупу імі зямлі.

На аснове аналізу шырокага кола крыніц С.А.Талмачова аргументавана паказала, што ўвядзенне інстытута земскіх нальнікаў як правобраза міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу. Гэта было абумоўлена сумяшчэннем у адной асобе земскага начальніка адміністрацыйных і судовых функцый, ліквідацыяй міравога суда ў сельскай мясцовасці, жорсткім кантролем над органамі сялянскага самакіравання. Асабліва важнае значэнне гэта набыло пасля пачатку сталыпінскай аграрнай рэформы. Пры гэтым адміністратыўная ўлада земскіх начальнікаў і іх з’ездаў узмацніла павятовае звяно дзяржаўнага кіравання.

Новым у айчыннай гістарыяграфіі стала і даследаванне губернскіх прысутнасцей, якія прыйшлі на змену губернскім па сялянскіх справах прысутнасцям. С.А.Талмачова абгрунтавала прычыны такога рэфармавання, паказала іх важную ролю ў рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў, шырокія паўнамоцтвы па каардынацыі і кантролю над дзейнасцю земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў. С.А.Талмачова ў дысертацыі аргументавана паказала, што новыя органы – губернскія прысутнасці – больш дасканала выконвалі свае функцыянальныя абавязкі.

Да дасягненняў дысертацыйнага даследавання трэба аднесці вызначэнне месца і ролі павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій у сістэме органаў мясцовага кіравання. Правядзенню сталыпінскай аграрнай рэформы ўдзялялася значная ўвага ў беларускай гістарыяграфіі. Аднак саіскальнік

упершыню раскрыла механізм узаемадзеяння землеўладкавальных камісій з земскімі начальнікамі, іх павятовымі з'ездамі, губернскімі прысутнасцямі, ад якіх залежала выніковасць рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы на тэрыторыі Беларусі.

**Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і палажэнняў, сфармуляваных у дысертацыі, заснаваны на аналізе, верыфікацыі і сінтэзе вялікай колькасці інфармацыі, пачэрпнутай саіскальнікам з фондаў архіваў Беларусі, Расіі і Літвы, а таксама з апублікаваных крыніц. Спалучэнне значнага эмпірычнага матэрыялу з рэалізаванымі прынцыпамі гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу, а таксама метадамі гістарычнага пазнання дазволіла выйсці на аб'ектыўныя высновы, якія носяць канцэптуальны характар.

Шэраг фрагментаў даследавання суправаджаецца аўтарскімі табліцамі, змешчанымі ў дадатках, што надае высновам канкрэтнасць і аргументаванасць.

Высокая ступень верагоднасці вывадаў і рэкамендацый абумоўлена таксама крытычным пераасэнсаваннем назапашаных ведаў па праблеме даследавання ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі С.А.Талмачовай заключаецца ў тым, што яны дазваляюць больш глыбока асэнсаваць аграрную палітыку ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і яе практычную рэалізацыю спецыяльна створанымі дзяржаўнымі інстытутамі кіравання на мясцовым і цэнтральным узроўнях.

Высновы, зробленыя саіскальнікам, адкрываюць новыя перспектывы ў даследаванні такіх праблем, як узаемадзеянне імперскага цэнтра і органаў ўлады і кіравання на губернскім і павятовым узроўнях, уплыў вынікаў аграрных пераўтварэнняў на мадэрнізацыю сацыяльна-эканамічных адносін, успрынятне сялянствам аграрных рэформ на ментальным узроўні і інш.

Практычная значнасць. Вынікі даследавання знойдуць прымяненне пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых выданняў, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў па гісторыі Беларусі і Расіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Акрамя таго, матэрыялы дысертацыі атрымаюць прымяненне на лекцыйных і семінарскіх занятках па гісторыі Беларусі, Расіі, а таксама гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Тэарэтычныя палажэнні і фактычны матэрыял будуць карыснымі пры падрыхтоўцы дысцыплін спецыялізацыі, напісанні вучэбных і даследчыцкіх работ студэнтамі і аспірантамі. Матэрыялы

даследавання могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання, гістарычнымі і этнаграфічнымі музеямі Рэспублікі Беларусь.

Сацыяльная значнасць. Гістарычная навука, як ніякая іншая, выконвае функцыі сацыяльнай памяці і выхаваўчую. Грунтоўныя даследаванні мінулага даюць магчымасць зразумець і асэнсаваць месца Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце. Гістарычны вопыт дазваляе пазбегнуць памылак у сучасным і тым самым аптымізаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, у тым ліку і ў аграрным сектары эканомікі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Атрыманыя ў працэсе падрыхтоўкі дысертацыі вынікі адлюстраваны ў 84 публікацыях, у тым ліку ў 1 манаграфіі (20,0 аўт. л.), 14 раздзелах у калектыўных навуковых выданнях, падрыхтаваных у сааўтарстве (19,4 аўт. л.), 21 артыкуле ў выданнях, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікаванння вынікаў дысертацыйных даследаванняў (15,9 аўт. л.), у тым ліку 2 – у замежных выданнях, уключаных у рэфератыўную базу данных Scopus і Web of Science (2,1 аўт. л.), 12 – у рэцэнзаваных зборніках навуковых артыкулаў (6,7 аўт. л.), 36 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (16,8 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 78,8 аўт. л.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Афармленне дысертацыі поўнасцю адпавядае інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь ад 28.02.2014 г.: прысутнічаюць усе неабходныя структурныя часткі; парушэнняў у афармленні дадаткаў і табліц не выяўлена; у дысертацыі ёсць усе неабходныя спасылкі на аўтараў і крыніцы, якія былі выкарыстаны саіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстаўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**.

Узровень падрыхтоўкі дысертацыйнага даследавання, аб'ём і якасць фактычнага матэрыялу, яго інтэрпрэтацыя, навізна і грунтоўнасць зробленых у дысертацыі высноў, а таксама апублікаванасць вынікаў работы і і іх значная апрабацыя на навуковых канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню сведчаць пра высокую навуковую кваліфікацыю С.А.Талмачовай і адпаведнасць яе вучонай ступені доктара гістарычных навук.

**Недахопы дысертацыі.** Разам з тым пры ўважлівым азнаямленні з дысертацыяй узніклі заўвагі і пытанні, якія патрабуюць дадатковага каментарыя саіскальніка.

- Ці варта было вызначаць у якасці асобнай даследчыцкай задачы "высветліць ступень навуковай распрацаванасці праблемы і інфармацыйныя

магчымасці крыніц для раскрыцця прадмета даследавання” (с. 7)? Гэта само сабой зразумелы неабходны этап любога даследавання, а тым больш доктарскай дысертацыі.

- У раздзеле 1.1 “Гістарыяграфія праблемы” саіскальніца нярэдка больш дэталізавана раскрывае работы польскіх і літоўскіх аўтараў у параўнанні з беларускімі даследчыкамі, працы якіх маюць больш непасрэдныя адносіны да прадмета вывучэння ў дысертацыі. Не магу пагадзіцца з кароткім упамінаннем манаграфіі М. Улашчыка (с. 25), простым пералічэннем такіх даследчыкаў як У. Пічэта, К. Кернажыцкі, У. Ігнатоўскі і інш. (с. 24). Іх працы складаюць гістарыяграфічную аснову вывучэння тэмы дысертацыйнага даследавання. Тым больш мне незразумела, навошта цэлы абзац адводзіць работам В. Шутавай, якія не маюць непасрэднага і нават ускоснага дачынення да тэмы вывучэння (с. 27 – 28). Не магу пагадзіцца з ацэнкай работ А. Стралені, Т. Доўгач (с. 29), якія падрыхтавалі і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі па тэмах, якія самым непасрэдным чынам датычацца прадмета вывучэння ў доктарскай дысертацыі С.А. Талмачовай. Лічу, што работам апошніх можна было б даць ацэнку больш разгорнутую і аргументаваную.

- Не згодзен з прыведзенай у раздзеле 1.2 “Характарыстыка крыніц” вельмі кароткай і празмерна аднназначнай ацэнкай статыстычных крыніц, якія, паводле саіскальніцы, “звычайна не супастаўныя, таму што выкарыстоўвалася розная методыка падлікаў, не існавала адзінай праграмы збору і апрацоўкі даных” (с. 39). Статыстычныя крыніцы, на мой погляд, займаюць значнае месца ў працах па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Саіскальніцы варта было больш падрабязна спыніцца на характарыстыцы выкарыстаных статыстычных крыніц, абазначыць іх, зрабіць іх верыфікацыю і вызначыць абгрунтавана ступень іх рэпрэзентатыўнасці. Упэўнены, што пры падрыхтоўцы дысертацыі саіскальніца шмат з імі працавала. Дадатак да дысертацыі таму падцвярджэнне.

- Няшмат у параўнанні з характарыстыкай выкарыстаных метадаў даследавання саіскальніца ў раздзеле 1.3 “Метадалогія і канцэпцыя даследавання” надае ўвагі прымяненню у сваёй дысертацыі мадэрнізацыйный парадыгмы, ніякім чынам не тлумачачы як практычна яна была выкарыстана ў працы, якіх вынікаў удалося дасягнуць з яе дапамогай (с. 45).

- Адзначаючы на с. 45 як адметную асаблівасць рэгіянальны падыход у рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі і вылучаючы два рэгіёны, саіскальніца чамусьці нікуды не адносіць Мінскую губерню.

- Саіскальніца ўвяла ў навуковы зварот вялікую колькасць архіўных крыніц, грунтоўна паказала функцыянальныя абавязкі мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі, вызначыла іх асабовы склад, але ў дысертацыі хацелася б больш бачыць канкрэтных

людзей, асобы чыноўнікаў і вынікі іх практычнай дзейнасці, складанасці, з якімі яны сустракаліся ў сваёй працы.

- Можна было б больш разгорнута паказаць як мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі ў Беларусі суадносіліся ў сваёй практычнай працы з іншымі органамі дзяржаўнага кіравання, даць больш шырокі параўнальны (у суадносінах з суседнімі губернямі, рэгіёнамі) аналіз іх дзейнасці.

Аднак выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковую вартасць праведзенага даследавання.

**Заключэнне.**

Дысертацыя Талмачовай Святланы Аляксандраўны “Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)” уяўляе сабой актуальнае, комплекснае даследаванне, якое непасрэдна звязана з распрацоўкай новага напрамку ў айчыннай гістарыяграфіі, утрымлівае новыя, навукова абгрунтаваныя вынікі, якія маюць тэарэтычнае і практычнае значэнне для далейшага развіцця сучаснай гістарычнай навукі.

Дысертацыя адпавядае патрабаванням, устаноўленых главой 3 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў ў Рэспубліцы Беларусь, а Талмачова Святлана Аляксандраўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук за:

- распрацоўку аўтарскай канцэпцыі, якая раскрывае стварэнне, функцыянаванне і практычную дзейнасць мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.;
- абгрунтаванне этапаў аграрнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі і перыядызацыі функцыянавання спецыяльна створаных для яе рэалізацыі органаў дзяржаўнага кіравання, выяўленне рэгіянальных асаблівасцей у іх дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.;
- выяўленне тэндэнцый і адметных рыс практычнай работы губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей на тэрыторыі Беларусі па каардынацыі дзейнасці міравых пасрэднікаў і іх з’ездаў; зацвярджэнні праектаў размеркавання сялян па абшчынах і валасцях, а таксама ўстаўных грамат, выкупных і люстрацыйных актаў; землеўладкаванні сацыяльных груп вясковага насельніцтва;
- вызначэнне ролі павятовых паверачных камісій у пазямельным уладкаванні сялян і іх пераводзе на выкуп, што з’явілася адметнай рысай рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. у Беларусі; раскрыццё кірункаў практычнай дзейнасці спецыяльных органаў па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў, выяўленне тэндэнцый у ажыццяўленні

чыншавай рэформы і ступені фінансавай падтрымкі чыншавікоў у працэсе выкупу імі зямлі;

- выяўленне сутнасці і спецыфікі ўвядзення інстытута земскіх начальнікаў, вызначэнне асаблівасцей фарміравання яго кадравага складу у беларускіх губернях, характарыстыку дзейнасці земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў як органаў адміністрацыйнай улады ў сельскай мясцовасці;
- адлюстраванне асаблівасцей рэарганізацыі губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у Беларусі, вызначэнне функцыянальных абавязкаў губернскіх прысутнасцей і іх ролі ў ажыццяўленні аграрных пераўтварэнняў у пачатку XX ст.;
- раскрыццё асноўных кірункаў і механізму ўзаемадзеяння землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у працэсе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы ў Беларусі.

Афіцыйны апанент,
доктар гістарычных навук, прафесар,
дэкан гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А.Г.Каханоўскі
05 мая 2023

ПОДПИСЬ ______ УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. начальника управления
организационной работы и
документационного обеспечения
«05» 05 20